*Слова друкаванае: 1905 — 1917 гг.*

1905 год для беларусаў стаў паваротнай вяхой да новай эпохі, зусім інакшай ад папярэдніх. Небывалы ўздым пачаўся і ў беларускім кнігадрукаванні. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 – 1907 гг. адкрылі магчымасць з'яўлення легальных беларускіх выдавецтваў і перыядычных выданняў. Была адменена забарона выкарыстання лацінскага шрыфту ў беларускім друку. 1 мая 1905 г. камітэт міністраў пастанавіў "распарадзіцца скасаваць меры, якія абмяжоўваюць ужыванне мясцовых моў у заходнім краі".

Пачынаючы з 1906 г. вызначыліся тры асноўныя цэнтры беларускага кнігадрукавання – Санкт-Пецярбург, Вільня і Мінск.

## ВЫДАВЕЦКАЯ СУПОЛКА "ЗАГЛЯНЕ СОНЦА І Ў НАША АКОНЦА"

У маі 1906 г. у Пецярбургу пачалася дзейнасць новай беларускай кнігавыдавецкай суполкі **"Загляне сонца і ў наша аконца"**, натарыяльна пацверджаная дамовай (ад 13 мая), якую падпісалі студэнт Горнага інстытута Вінцук Валейка, чыноўнік Уладзіслаў Сталыгва, інжынер-тэхнолаг Юрый Іваноўскі, настаўнік Уладзіслаў Калашэўскі і інш. Ініцыятыва заснавання выдавецтва належала Бранiславу Эпімаху-Шыпілу, які пайшоў нават на тое, каб у сваёй кватэры размясціць кантору суполкі. У спісе арганізатараў выдавецтва сустракаюцца імёны ўдзельнікаў "Круга беларускай народнай прасветы і культуры". Таварыства занялося сістэматычным і планамерным выданнем беларускіх кніг. Як сведчыць даследчыца дзейнасці выдавецтва Надзея Ракіцкая, за гады яго існавання ўбачылі свет "39 кніг літаратурнага, грамадска-палітычнага, бытавога, навукова-папулярнага зместу, агульным тыражом больш за сто тысяч экзэмпляраў". [Дарэчы, у артыкуле названага аўтара, які змешчаны ў адзіным выпуску альманаха бібліяфілаў Беларусі "Свіцязь" (1989), прыведзены «Спіс кніг, выдадзеных суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу», паводле якога можна папоўніць зводны каталог "Кніга Беларусі, 1517 – 1917" (Мінск, 1986) выданнем 1912 г. "На дарозі да новага жыцця" Антона Навіны (Антона Луцкевіча), а таксама звесткамі пра месца выдання і выдавецтва ў апісанні кнігі 1916 г. "Чарка ўсё на свеце робіць" Якуба Коласа – апошняга друкаванага выдання суполкі.]


№ 3.

БЕЛАРУСКИ ЛЕМЭНТАР

Першая навука чытання.

Цэна 6 кап.

ПЕЦЯРБУРГ.

Першая кніга, выдадзеная суполкай, – "Беларускі лемантар, або Першая навука чытання", тоненькая брашурка з трыццаці старонак. Хоць лемантар быў адрасаваны дзецям, паводле характару прадмовы можна меркаваць, што выдаўцы мелі яшчэ і другую мэту – навучыць чытаць беларускую сялянскую масу або прывучыць пісьменных у рускай ці польскай мове да беларускага друкаванага слова.

Для навучання суполка выдала яшчэ некалькі кніг, аўтарамі якіх з'яўляліся Цётка і Якуб Колас. Асноўнай жа прадукцыяй пецярбургскага беларускага выдавецтва былі творы мастацкай літаратуры, сярод якіх драматычныя п'есы і камедыі для тэатральнай сцэны, з беларускімі песнямі і нотна-музычным матэрыялам, пераклады з польскай, рускай і украінскай моў: "Пашыліся ў дурні" Марка Крапіўніцкага, "У зімовы вечар" Элізы Ажэшкі, "Сватанне" Антона Чэхава, а таксама арыгінальны беларускі твор – вадэвіль "Модны шляхцюк" Каруся Каганца, якія выйшлі ў 1910 г. У наступныя гады былі выдадзены кнігі "Па рэвізіі" Марка Крапіўніцкага, "Міхалка" Далецкіх (абедзве 1911), "Паўлінка" Янкі Купалы, "Хам" Элізы Ажэшкі (абедзве 1912), "Як яны жаніліся" А. Валодзьскага, "Мядзведзь" Антона Чэхава (абедзве 1913). Са сцэны загучала беларускае слова, нараджаўся беларускі тэатр, што стала яшчэ адным сведчаннем развіцця беларускай культуры. А выданні суполкі дапамаглі іх станаўленню.

Для друку беларускамоўных кніг суполка выкарыстоўвала два шрыфты – кірылічны і лацінскі. Выдаўцы ўлічвалі пэўныя культурныя традыцыі таго ці іншага аўтара, а таксама чытацкай аўдыторыі ("польская" ці "руская"). Некаторыя такія выданні, як "Беларускі лемантар, або Першая навука чытання", "Першае чытанне для дзетак беларусаў" Цёткі (абодва 1906), "Маладая Беларусь" (сш. 1, 1912; сш. 2, 1912; сш. 3, 1913), выйшлі і кірыліцай, і лацінкай. Большасць жа выданняў (20) суполкі надрукавана кірыліцай: "Гутаркі аб небі і зямлі" (1907), "Жалейка" Янкі Купалы (1908), "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Якуба Коласа (1909), "Сватанне" Антона Чэхава, "Модны шляхцюк" Каруся Каганца, "Пашыліся ў дурні" Марка Крапіўніцкага, "У зімовы вечар" Элізы Ажэшкі (усе 1910), "У дому лепей" А. Новіча, "Міхалка" Далецкіх, "Па рэвізіі" Марка Крапіўніцкага (усе 1911), "Сон на кургане" Янкі Купалы, "Хам" Элізы Ажэшкі, "На дарозі да новага жыцця" Антона Навіны (усе 1912), "Паўлінка" Янкі Купалы, "Амерыканец" А. Новіча, "Як яны жаніліся" А. Валодзьскага (усе 1913), "Мядзведзь" Ан-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2006 год

КАСТРЫЧНІК

*Заканчэнне. Пачатак на с. 76.*

**17 кастрычніка** – 70 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Станюты, крытыка, літаратуразнаўцы, пісьменніка

**18 кастрычніка** – 100 гадоў з дня нараджэння Алеся Салагуба (1906 – 1934), паэта, літаратуразнаўцы, публіцыста

70 гадоў з дня нараджэння Любові Пакаташкінай, графіка, плакатыста

60 гадоў з дня нараджэння Ганада Чарказяна, курда-, армяна- і рускамоўнага паэта

**19 кастрычніка** – 100 гадоў з дня нараджэння Марыі Жыдовіч (1906 – 1977), мовазнаўцы, заслужанага дзеяча навук Беларусі

70 гадоў з дня нараджэння Эдуарда Гарачага, акцёра, заслужанага артыста Беларусі

**20 кастрычніка** – 100 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Быліча (1906 – 1944), акцёра, заслужанага артыста Беларусі

тона Чэхава (1914), "Чарка ўсё на свеце робіць" Якуба Коласа (1916). Адзінаццаць выданняў выйшлі толькі лацінскім шрыфтам: "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча (1907) у перакладзе Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, а таксама ўласныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча "Гапон" (1907), "Вечарніцы" (1909), "Шчароўскія дажынкі. Купала" (1910), творы Францішка Багушэвіча – "Дудка беларуская" (1907, 1914), "Смык беларускі" (1908), "Батрак" Якуба Коласа, "Песні" Цішкі Гартнага, "Абразкі" Змітрака Бядулі (усе 1913).

Таварыства ў 1907 г. заснавала падпісную серыю "Беларускія песняры", у якой было запланавана да выхаду восем кніг. Але атрымалася выдаць усяго шэсць: "Дудка беларуская" Ф. Багушэвіча (1907), "Пан Тадэвуш" А. Міцкевіча (1907), "Гапон" В. Дуніна-Марцінкевіча (1907), "Смык беларускі" Ф. Багушэвіча (1908), "Вечарніцы" В. Дуніна-Марцінкевіча (1909), "Шчароўскія дажынкі. Купала" В. Дуніна-Марцінкевіча (1910).


BIELARUSKI LEMENTAR

Pierszaja nawuka czytannia

Восенню 1908 г. часовы камітэт па справах друку ў Вільні адправіў пецярбургскім калегам кнігі Ф. Багушэвіча, выдадзеныя суполкай. На пасяджэннях 24 і 28 кастрычніка 1908 г. камітэт пастанавіў накласці на абедзве кнігі арышт і прыцягнуць да адказнасці выдаўцоў. Пра "Дудку беларускую" ў абвінавачванні напісана: "Брашура гэта ёсць зборнік вершаў, напісаных на тэмы з жыцця беларускага селяніна, і ставіць сваёй галоўнай мэтай паказаць беларуса, які пакутуе ад здзекаў улады і прыгнёту паноў". Толькі ў выніку доўгіх намаганняў выдаўцоў арышт быў зняты 23 лістапада 1910 г. і зборнікі паступілі ў продаж у 1911 г.

У шостай кнізе з серыі "Беларускія песняры" быў змешчаны ў якасці ўступу грунтоўны артыкул "Вінцук Дунін-Марцінкевіч і яго жыццё" В. Тройцы (псеўданім Вацлава Іваноўскага) – адна з першых у беларускім літаратуразнаўстве спробаў паказаць значэнне і месца В. Дуніна-Марцінкевіча ў нашай літаратуры.

Суполка таксама выпусціла тры навукова-папулярныя выданні па астраноміі, ветэрынарыі, пчалярстве і адно масава-палітычнае.

Упершыню выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша аконца" ажыццёўлены друк беларускіх паштовак ("пісулек") з выявамі беларускага пейзажу, партрэтамі беларускіх пісьменнікаў, малюнкамі тыпаў беларускіх сялян і іх побыту. Усяго надрукавана больш за 20 паштовак.

Таварыства наладзіла партнерскія стасункі з пецярбургскай друкарняй Казіміра Пянткоўскага і асноўную частку сваіх кніг выпускала на Вялікай Пад'ячаўскай, 22, дзе і размяшчалася друкарня. Праўда, два выданні кірыліцай і лацінкай былі замоўлены ў друкарні Марціна Кухты ("Як ратаваць уздутую жывёлу?" К. Дулембы ў перакладзе з польскай мовы А. Хатняга, 1909) і адно ў друкарні Юрыя Эрліха – зборнік вершаў "Шляхам гадоў" Янкі Купалы (1913), у выданні якога дапамог доктар Аляксандр Ярэміч. Грашовыя ахвяраванні паступалі суполцы "Загляне сонца і ў наша аконца", а таксама "Нашай Ніве" ад княгіні Магдалены Радзівіл. Суполка супрацоўнічала і з іншымі выдавецкімі таварыствамі – "Мінчуком", які перадаў правы выдання "Жалейкі" Янкі Купалы сваім пецярбургскім калегам, і віленскім выдавецтвам "Наша хата", сумесна з якім выдадзена "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Якуба Коласа. На пачатку 1909 г. выдавецтва, сутыкнуўшыся з пэўнымі фінансавымі цяжкасцямі, звязанымі з арыштам кніг Ф. Багушэвіча, вымушана было заключыць новую дамову пра выдавецкую дзейнасць. Так, 30 красавіка 1909 г. адбылася пераарганізацыя таварыства: у яго ўвайшлі новыя члены Антон і Юлія Трэпкі-Неканды, Антон Грыневіч, Генрых Ражноўскі і праца была прадоўжана. Выпраўленнем выдавецкай справы суполкі актыўна заняўся А. Грыневіч, якому ўдалося паспяхова завяршыць у гэты час падпісную серыю "Беларускія песняры". У 1913 г. упершыню выйшлі з друку зборнік вершаў "Песні" Цішкі Гартнага і кніга прозы "Абразкі" Змітрака Бядулі. Суполка першая з усіх беларускіх выдавецтваў паспрабавала заснаваць беларускі часопіс. Ім павінна было стаць выданне "Маладая Беларусь" (выйшла тры нумары ў 1912 і 1913 гг.).

Суполка наладжвала кніжныя сувязі і адкрывала контрагенцтвы ў Варшаве, Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі, у якія беларускія кнігі перасылаліся з Пецярбурга. Акрамя таго, займалася перасылкай кніг кожнаму ахвотнаму, даючы аб'явы ў "Нашай Ніве" пра выхад сваіх кніг і магчымасць іх набыцця з дасылкай. У 1913 г. быў нават аб'яўлены конкурс на найлепшыя сцэнічныя творы для выдавецтва, за якія абяцалася грашовае ўзнагароджанне. У выдавецтве прадаваліся таксама кнігі пра Беларусь на рускай і польскай мовах. Гэта ўсё дазваляла рабіць немалыя тыражы выданняў. Напрыклад, большасць кніг з серыі "Беларускія песняры" выходзіла накладам 4 300 экзэмпляраў.

У 1916 г. выдавецтва паспрабавала аднавіць дзейнасць, выпусціўшы п'есу Якуба Коласа "Антось Лата" пад назвай "Чарка ўсё на свеце робіць" (1-ю дзею), на якой было пазначана "Працяг будзе". Аднак на гэтым выдавецкая дзейнасць суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца", перапыненая ваеннымі і рэвалюцыйнымі падзеямі, закончылася. Яшчэ ў першай друкаванай адозве суполкі 1906 г. звяртаюць на сябе ўвагу такія словы: "Маем надзею, што прыклад Пецярбурга не астанецца без адзыву. Цяпер можна легальна склікаць і злажыць разам шмат параскіданых сіл". Спадзяванні членаў суполкі спраўдзіліся.

**Лора ДОЎНАР.**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

90 гадоў з дня нараджэння Алеся Сучка (сапр. Пётр Дабрыян; 1916 – 1993), паэта

**21 кастрычніка** – 165 гадоў з дня нараджэння Сільвестра Балтрамайціса (1841 – 1918?), літоўскага і беларускага бібліёграфа

130 гадоў з дня нараджэння Сяргея Скандракова (1876 – 1953), вучонага, журналіста, рэдактара-выдаўца

85 гадоў з дня нараджэння Івана Муравейкі, паэта, заслужанага работніка культуры Беларусі

**25 кастрычніка** – 70 гадоў з дня нараджэння Віктара Турава (1936 – 1996), кінарэжысёра, народнага артыста Беларусі і СССР

**27 кастрычніка** – 95 гадоў з дня нараджэння Міколы Лобана (1911 – 1984), пісьменніка і мовазнаўцы, заслужанага работніка культуры Беларусі

**29 кастрычніка** – 60 гадоў з дня нараджэння Ніны Мячкоўскай, мовазнаўцы

**31 кастрычніка** – 75 гадоў з дня нараджэння Тамары Шашкінай, актрысы, заслужанай артысткі Беларусі

70 гадоў з дня нараджэння Івана Хоміча (1936 – 1992), скульптара

145 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Лапо (1861 – 1936), беларускага і рускага пісьменніка, грамадскага дзеяча

80 гадоў таму заснаваны Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР. Існаваў у Мінску да красавіка 1949 г.